З першых вуснаў

# «Мы краіну на шчыты не складваем»

**Прэзідэнт у размове з выканаўчым сакратаром Садружнасці Незалежных Дзяржаў Сяргеем Лебедзевым абмеркаваў падзеі, якія адбываліся ў Беларусі ў ноч пасля выбараў.**

«Ноччу хадзілі, бадзяліся, спрабавалі хлопцаў з міліцыі атакаваць і ў асобных момантах атакавалі. Але хлопцы годна выстаялі і адказалі. Ёсць у нас людзі пацярпелыя. Канешне, гэта нязначныя (раненні. — «Зв.») — стральбы не было. Але тым не менш і тым, і тым дасталося — і з боку міліцыі, і з боку грамадзянскага насельніцтва. Каля 40—50 чалавек грамадзянскага насельніцтва і каля 30 міліцыянераў пацярпелі», — паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

Ён назваў фэйкамі паведамленні, што ў нейкім горадзе АМАПаўцы склалі шчыты. «Пачынаю ўдакладняць — абсалютная хлусня. Звычайныя, простыя хлопцы кажуць: «Мы краіну на шчыты не складваем. Мы будзем абараняць, наколькі гэта магчыма», — канстатаваў Прэзідэнт.

Па яго інфармацыі абаранцаў прыйшлося спакой не толькі мінчан, але і іншых кандыдатаў. Па словах кіраўніка краіны, аб'яднаныя штабы і апазіцыйныя журналісты, усяго каля 60 чалавек, былі сабраны ў адным офісе.

«Мы атрымалі інфармацыю ад іх жа, хтосьці там з галавой сябрує. Яны ўбачылі, што вакол гэтага офіса натоўп сабраўся, вострая сітуацыя. І ад іх хтосьці папрасіў, каб улада іх абараніла. Я даручыў КДБ імгненна самых моцных вайскоўцаў накіраваць негалосна, узяць пад кантроль гэты офіс, каб не дай бог, не забілі каго-небудзь. Была патрэбна сакральная ахвяра, — працытаваў Аляксандр Лукашэнка. — Мы іх абаранялі ўсю ноч, і зараз кантралюем сітуацыю, каб, не дай бог, хтосьці камусьці не адарваў галаву».

Інфармацыю пра забойства польскага грамадзяніна Прэзідэнт таксама назваў выдумкай.

«Ім патрэбна ахвяра. Вы бачыце, што там школьнікі ёсць, 16, 17, 18 гадоў, розныя, — куды глядзяць бацькі? Іх жа проста кідаюць на штыкі лялькаводы, а самі хаваюцца за спіны», — дадаў ён.

Прэзідэнт адзначыў, што затрымалі па краіне каля 3000 арганізатараў беспарадкаў, амаль палову з іх у Мінску. «Яны хаваюцца і штурхаюць гэтых. Абкураных, п'яных шмат, з наркотыкамі — жах. Мы кантралюем, каб, не дай бог, не дапусціць гэтага пажару», — дадаў лідар.

Кіраўнік краіны паведаміў, што самае небяспечнае, што ў дзень выбараў 33 участкі ў Мінску блакіравалі натоўпы, і яму прыйшлося прыцягнуць ваенных, каб эвакуіраваць камісіі. У тым ліку і з Дома ўрада Цэнтральную выбарчую камісію і яе кіраўніка Лідзію Ярмошыну.

«Я ўсіх папярэдзіў, і ўлада з гэтым справілася. Ды і тое вельмі мякка адносіліся. Не па законе, вельмі мякка падыходзілі. Яны нейкае УУС ці РУУС хацелі штурмам узяць і публічна сарвалі шлем з хлопца-АМАПаўца... Добра, што паспелі хлопцы з АМАПа і нават, па-мойму, гумавыя кулі прымянілі ў гэты момант, разагналі натоўп. Сітуацыя была ноччу напружаная, але малайцы, міліцыя справілася. Армію і службу бяспекі мы прыцягнулі толькі, каб эвакуіраваць выбарчыя камісіі», — расказаў кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка назваў выбары святам, «якое камусьці захацелася сапсаваць».

«Мы іх убачылі, яшчэ ярчэй яны засвяціліся гэтай ноччу. Мы адфіксавалі ўсе званкі з-за мяжы — з Польшчы, з Вялікабрытаніі, і з Чэхіі былі апошнія званкі, кіруючы нашымі, прабачце мяне, авечкамі. Яны не разумеюць, што робяць. Адна ж з'ехала кудысьці, ці ў Польшчу, ці то ў Расію. Двое засталіся. Яны ж не разумеюць, што робяць. Імі пачынаюць ужо кіраваць», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ва ўездзе ў Беларусь адмоўлена амаль 180 чалавекам, якія мелі фальшывыя дакументы ці не ведалі, навошта едуць.

Па словах Прэзідэнта, з-за мяжы адключаюць інтэрнэт, каб выклікаць незадаволенасць насельніцтва. Спецыялісты разбіраюцца, адкуль ідзе блакіроўка. «Калі інтэрнэт дрэнна працуе, гэта не наша ініцыятыва, а з-за мяжы. То-бок дзейнічаюць мэтанакіравана, гібрыдна па ўсіх кірунках. Але мы вытрымаем», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА.**

• **Каментарый у тэму**

## Прэзідэнт Беларусі імкнецца кансалідаваць беларускі народ

**Пра гэта па выніках размовы з кіраўніком краіны расказаў журналістам Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ.**



«Ён сказаў, што ёсць людзі, якія прытрымліваюцца іншай пазіцыі, меркавання. Яны сваё меркаванне выказалі, прагаласавалі за альтэрнатыўных кандыдатаў. Але ён Прэзідэнт усёй Беларусі і ўсяго беларускага народа і, канешне, будзе ўлічваць настрої людзей. Самае галоўнае — у інтарэсах міру, стабільнасці і далейшага руху Беларусі наперад і ў эканамічнай, і ў культурнай сферы», — акцэнтаваў увагу прадстаўнік СНД.

Як заўважыў Сяргей Лебедзеў, галасы былі аддадзены і за альтэрнатыўных кандыдатаў, якія ў сваіх выступленнях казалі пра недапушчальнасць майданаў і кровапраліцця.

«Прэзідэнт мне сказаў, што ў спецслужбаў ёсць важкія падставы для таго, каб убачыць за ўсімі падзеямі, якія адбыліся ўчора ў Мінску, руку правакатараў, — дадаў ён. — Перамовы, якія вялі арганізатары акцый і іншыя факты сведчаць пра тое, што было жаданне дэстабілізаваць абстаноўку, але дзякуй богу (гэта таксама меркаванне Прэзідэнта) удалося не дапусціць нейкіх катастрафічных падзей і наступстваў гэтых выступленняў».

Сяргей Лебедзеў падзяляе спадзяванне Прэзідэнта Беларусі, што пасля выбараў меншасць згодзіцца з меркаваннем большасці беларусаў.

# «Гэта больш, чым космас»

**Так Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сказаў пра тэхналогіі, якія з'явяцца праз тры-чатыры гады на адлегласці 43 кіламетры ад Мінска, у Пухавіцкім раёне. Тут, каля вёскі Уборы ўжо ўведзеныя ў эксплуатацыю першыя аб'екты Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі.**

Трэба сказаць, што сельскай гаспадарцы кіраўнік дзяржавы прысвяціў пярэдадзень асноўнага дня галасавання на прэзідэнцкіх выбарах і раніцу наступнага. Гэта засведчыла прытрымліванне яго слоў пра тое, што «пандэмія пандэміяй, выбары выбарамі, а есці хочацца заўсёды».

## Задача на сёлета — 10,5 мільёна тон збожжа

Уборачная кампанія — на асабістым кантролі кіраўніка дзяржавы. У суботу Аляксандр Лукашэнка наведаў ААТ «Гастэлаўскае» Мінскага раёна, дзе азнаёміўся са станам спраў у аграрным сектары непасрэдна на палетку азімай пшаніцы. Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Іван Крупко далажыў аб актыўнай рабоце па ўборцы збожжавых каласавых культур у краіне. Па стане на раніцу суботы ў Беларусі быў убраны 61 працэнт плошчаў (кожны дзень дадаецца каля пяці працэнтаў), атрымана амаль шэсць мільёнаў тон збожжа пры сярэдняй ураджайнасці 38,2 ц/га (на 6,1 працэнта больш, чым летась).

На полі хлеб гэты ёсць, яго трэба проста ўзяць, заўважыў Прэзідэнт. «Калі мы выйдзем на дзесяць з паловай (мільёнаў тон. — «Зв.») — гэта больш за тону на чалавека ў нас атрымаецца — больш у будучыні не трэба. Дзесяць з паловай на гэтым этапе дастаткова для краіны, каб накарміць скаціну і часткова забяспечыць БНБК», — абазначыў задачу кіраўнік дзяржавы. Ніжэй за гэты ўзровень апускацца нельга ні пры якіх умовах надвор'я, дадаў ён.



Фота БелТА.

Па падліках Аляксандра Лукашэнкі, новая тэхналагічная вытворчасць, якой стане Беларуская нацыянальная біятэхналагічная карпарацыя, мае патрэбу ад 800 тысяч да мільёна тон збожжа. Яго можна закупіць за мяжой, але пажадана, адзначыў кіраўнік дзяржавы, каб беларусы самі яго вырасцілі.

## Новая сельская гаспадарка

Раніцай пасля выбараў Аляксандр Лукашэнка наведаў пляцоўку той самай Беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі, пра якую казаў на полі «Гастэлаўскага». Тут ужо гатовы прымаць беларускае збожжа, да канца жніўня ўвядуць у эксплуатацыю збожжасховішча, аўтапрадпрыемства, вадавод, кацельню, чыгунку, газапровад і лінію электраперадачы, у верасні запрацуюць заводы па вытворчасці прэміксаў (магутнасцю 150 тысяч тон), камбікармоў для рыб (110 тысяч тон), свіней (316 тысяч тон), буйной рагатай жывёлы і птушкі (450 тысяч тон). Агулам — больш за адзін мільён тон гатовай прадукцыі ў год. Адначасова тут можна захоўваць 450 тысяч тон сіласу, дасушваць 400 тон збожжа ў гадзіну.

Інвестыцыйная пляцоўка плошчай 160 гектараў падзелена на дзве зоны — аграпрамысловую і біятэхналагічную. Кантракты на продаж прадукцыі першай зоны ўжо падпісаныя. Рэнтабельнасць складзе 15—20 працэнтаў, але ў будучым можа вырасці.

Другая зона прадугледжвае вытворчасць вітамінаў. Яна ўключае мукамольны завод, вытворчасць крухмалу, глютэну, камбікормавай дабаўкі, глюкозы і прадукцыі біятэхналогій — лізіну (80 тысяч тон), трэаніну (8 тысяч тон) і трыптафану (1600 тон).

Чакаецца, што комплекс будзе вырабляць за год таварнай прадукцыі на суму 650 мільёнаў долараў, выпрацоўка на аднаго чалавека складзе 375 тысяч долараў (больш толькі ў нафтаперапрацоўчых заводаў).

Сваім гонарам кіраўніцтва карпарацыі называе навукова-даследчы цэнтр, у якім працуюць вучоныя некалькіх інстытутаў.

Пасля знаёмства з праектам перспектыўнага развіцця і планамі карпарацыі на найбліжэйшы час Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў свае ўражанні журналістам. Размову з імі распачаў фразай: «Адна справа — перамагчы, гэта важна, іншая справа — абараніць гэтую перамогу. Вось чым мы зараз і займаемся».

Калісьці Аляксандр Лукашэнка параўнаў тэхналогіі БНБК з касмічнымі, цяпер, адказваючы на пытанне, ці ўражаны ўбачаным, ён сказаў: «Космас будзе праз тры-чатыры гады, да 2024-га, калі мы будзем казаць не толькі пра перспектыву камбікармоў, не толькі пра дабаўкі і падобнае, але калі пачнём казаць пра лекі, вітаміны, гэта ўжо — космас. І гэты космас не далёкі, ужо распачатае праектаванне, трэцяя чарга ў наступныя тры гады будзе пабудаваная».

Прэзідэнт заўважыў, што пандэмія каранавіруса спыніла эканоміку ва ўсім свеце, у выніку атрымалася так, што кітайская інжынірынгавая кампанія з сусветным імя CITIC, якая з'яўляецца генеральным падрадчыкам праекта, на гэты час працуе толькі ў Беларусі.

«Наша шчасце, што мы абралі правільную тактыку і не закрылі краіну, — пракаментаваў сітуацыю кіраўнік дзяржавы. — Праз тры гады мы з вамі сюды прыедзем, дакладна прыедзем, і ўбачым тут касмічную вытворчасць. Такой вытворчасцю валодаюць адзінкі краін — чатыры ўсяго. І сярод іх Беларусь. Гэта больш, чым космас. Космасам мы з савецкіх часоў займаемся, а гэта цалкам новая вытворчасць».

Вельмі важна, што яна будзе працаваць на айчыннай сыравіне. 700 тысяч тон збожжа, па словах Прэзідэнта, сёння гатова купляць БНБК па сусветных цэнах, якія вышэйшыя, чым гранічныя максімальныя, якія рэкамендаваныя Мінсельгасхарчам Беларусі. Кіраўніцтва карпарацыі зацікаўленае ў вытворчасці збожжа ў раёне і гатова ў гэта інвеставаць грошы.

«Словам, гэта наймацнейшы лакаматыў аграпрамысловай вытворчасці і не толькі аграпрамысловай. Ну і не трэба забываць, што яны тут цэлы інстытут стварылі, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Яны будуць тут біятэхналогіі распрацоўваць, штамы свае і іншае, і рухаць вытворчасць».

Беларускі лідар падкрэсліў, што з'яўленнем «касмічных» тэхналогій у АПК краіна абавязана КНР і асабіста яе кіраўніку.

«Гэта падарунак кітайскага народа і асабіста гэтага чалавека, які толькі што мяне першы павіншаваў з нашай з вамі перамогай», — сказаў ён.

**Варвара МАРОЗАВА, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**